*Литература*

1. В Казахстане СМИ живут не по рыночным правилам // Накануне.KZ: проект независимых журналистов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://nakanune.kz/2015/11/19/в-казахстане-сми-живут-не-по-рыночным-п/. – Дата доступа: 10.04.2016.
2. Замок без границы // Lenta.ru: информационный портал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://lenta.ru/articles/2015/11/16/granica/. – Дата доступа: 30.04.2016.
3. AKAVITA.BY // Статистический интернет-ресурс [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://akavita.by/ru/top/All/All/30days/visitors/ desc/All/All. – Дата доступа: 06.04.2016.
4. Media Sustainability Index 2016. The Development of Sustainable Independent Media in Europe and Eurasia. – Washington: IREX, 2016. – 344 p.

**Таццяна Дасаева**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ Ў АСВЯТЛЕННІ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНАГА ВЫДАННЯ

«Культура» – штотыднёвая грамадска-асветніцкая газета, якая заснавана ў кастрычніку 1991 г. і ўваходзіць у рэдакцыйна-выдавецкую ўстанову «Культура і мастацтва».

Як вядома, 2016 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2015 г. № 522 аб’яўлены Годам культуры. Звернемся да матэрыялаў газеты «Культура» за 2016 г., у якіх асвятляецца міжнародная дзейнасць Беларусі ў галіне культуры.

9 студзеня ў рубрыцы «На маю думку» газета змясціла інтэрв’ю для радыё «Беларусь» міністра культуры Б. Святлова. Ён акрэсліў прыярытэтныя вектары працы галіны ў Год культуры, адзін з якіх – міжнародная дзейнасць. Міністр адзначыў наступнае: «Міжнародная дзейнасць у галіне культуры ажыццяўляецца як у традыцыйных формах – перадусім гэта абменныя дні культуры, якія ладзіць наша міністэрства са сваімі замежнымі партнёрамі, так і дзякуючы ініцыятывам канкрэтных устаноў альбо нават асобаў».

Як падкрэсліў Б. Святлоў, найважнейшай тэндэнцыяй апошняга часу стала ўзмацненне культурных сувязей з Кітаем. Яны распачаліся яшчэ ў першыя гады існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь, але менавіта візіт у нашу краіну Старшыні КНР Сі Цзіньпіна паслужыў

моцным штуршком для адкрыцця новых даглядаў супрацоўніцтва. У прыватнасці, у хуткай перспектыве чакаецца адкрыццё Культурнага цэнтра Беларусі ў Пекіне.

Б. Святлоў звярнуў увагу на наступную акалічнасць: калі раней кантакты адбываліся пераважна праз сталіцу Кітая, то цяпер узмацняецца сувязь і непасрэдна з яго тэрытарыяльнымі часткамі. У прыватнасці, у гэтым годзе плануецца разам з правінцыяй Ганьсу правесці Дні кітайскай культуры ў Беларусі.

Супрацоўніцтва з Кітаем асвятляеца ў шэрагу публікацый. Напрыклад, 27 лютага газета змясціла матэрыял «Новы год партнёрства», у якім паведамляецца, што ў Беларусі адбылося вясёлае веснавое свята – кітайскі Новы год. У рамках падзеі Мінск прыняў шэраг культурных мерапрыемстваў на буйных пляцоўках. У адкрыцці свята, якое 24 лютага ўключала прэзентацыю фотавыставы пра адметнасць Кітая і развіццё гэтай краіны «Новае аблічча Шоўкавага шляху» ў сталічнай гасцініцы «Пекін» і прэс-канферэнцыі, бралі ўдзел міністр культуры Рэспублікі Беларусь Б. Святлоў і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі Ц. Цымін.

У нататцы В. Ропат пад назвай «Краса паводле Юндзі» (5 сакавіка) паведамляецца, што ў Мінск упершыню прыехаў кітайскі піяніст Юндзі. Ён пазнаёміў сталічную публіку з уласнай інтэрпрэтацыяй твораў польскага класіка Ф. Шапэна. Як піша журналістка, гастролі маладога выканаўцы працягнуцца ў Францыі, Аўстрыі, Германіі, Расіі, ЗША.

Матэрыялы, у якіх асвятляюцца пытанні міжнароднага супрацоўніцтва Беларусі ў галіне культуры, размяшчаюцца ў розных рубрыках («Праекты развіцця», «Прыватная гісторыя», «На маю думу», «Тактыка культурнага развіцця», «Prof-партфоліа», «Art-блог» і інш.), але часцей за ўсё – у рубрыцы «Акно ў свет» з назвай замежнай краіны. Напрыклад, 12 сакавіка ў гэтай рубрыцы змешчана некалькі матэрыялаў, якія засведчылі міжнародныя сувязі Беларусі ў сферы культуры з Японіяй (П. Васілеўскі: «Інавацыі традыцый» – пра прыезд у Мінск з лекцыямі японскага дызайнера Р. Нанкі); з Індыяй (М. Забродская: «Пад “Ветах” у Нью-Дэлі» – пра удзел беларусаў у Міжнародным фестывалі «Мастацтва жыцця», дзе праходзіла сустрэча дэлегатаў з 155 краін свету з мэтай «прадэманстраваць асаблівасці і хараство кожнай нацыянальнай культуры, аб’яднаць людзей розных вераванняў і традыцый, падтрымаць мір на планеце»); з Латвіяй (Л. Гаўрылюк: «Персанальны ўнёсак у культуру» – пра Цэнтр беларускай культуры ў Даўгаўпілсе, створаны прадстаўнікамі беларускай дыяспары пры падтрымцы гарадской думы.

Я. Рагін у матэрыяле «Акцэнты і мэты пяці гадоў» (26 сакавіка) паведамляе, што Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 сакавіка 2016 г. №180 зацверджана Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2016–2020 гг. Аўтар артыкула падрабязна асвятляе вызначаныя ў дакуменце напрамкі развіцця культуры на бліжэйшыя пяць гадоў, засяроджвае ўвагу на міжнародным супрацоўніцтве, якое прадугледжваецца з краінамі, дзе ёсць беларускія дыяспары. Я. Рагін адзначае, што колькасны склад беларускай дыяспары ў свеце складае 2,5 млн чалавек, а грамадскія аб'яднанні беларусаў актыўна ажыццяўляюць сацыякультурную дзейнасць у Расіі, ва Украіне, у Латвіі, Эстоніі, Польшчы, Малдове. Беларускія дыяспары прысутнічаюць і ў Аўстраліі, Аўстрыі, Аргенціне, Вялікабрытаніі, Германіі, Канадзе, Нідэрландах, ЗША.

У матэрыяле Ю. Чарнякевіча «Профі ці вольны мастак?» (ад 2 красавіка) даецца інфармацыя аб тым, што ў Мінску ў прэс-цэнтры Беларускага тэлеграфнага агенцтва адбылася прэс-канерэнцыя «Праект Кодэкса Беларусі аб культуры: асаблівасці і навацыі». У публікацыі Ю. Чарнякевіча ад 2 ліпеня паведамляецца, што 24 чэрвеня дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны прынялі ў другім чытанні праект Кодэкса Беларусі аб культуры, а 30 чэрвеня дакумент ухвалены ў Савеце Рэспублікі.

У рубрыцы «На маю думку» 2 красавіка змешчаны матэрыял «Лічбавы шлях Скарыны» намесніка дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусі А. Сушы. Ён адзначыў, што выданні пачынальніка беларускага кнігадрукавання Ф. Скарыны сёння знаходзяцца ў многіх архівах і бібліятэках свету, таму надзвычайна важнай для нашай краіны стала падзея, што адбылася напрыканцы сакавіка. «Пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Пасольства нашай краіны ў Аб'яднаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі з Кембрыджа, дзе ў бібліятэцы мясцовага Траецкага каледжа захоўваецца выданне Францыска Скарыны, у Мінск, у Нацыянальную бібліятэку Беларусі, перададзена яго лічбавая копія».

7–8 красавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы краіны прайшлі чарговыя, XII па ліку, Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні «Кніжная культура Беларусі: погляд праз стагоддзі». Гэта падзея асвятляецца ў матэрыяле Ю. Чарнякевіча «У чаканні Скарынавага юбілею» (9 красавіка). Як адзначыў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Р. Матульскі, на канферэнцыю прыбылі больш за 200 удзельнікаў як з Беларусі, так і з Літвы, Латвіі, Украіны, Расіі, Польшчы, Венгрыі і Славакіі. У рамках канферэнцыі 7

красавіка ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава «Францыск Скарына і наш час», а 8 красавіка прайшоў круглы стол «Еўрапейская дакументальная спадчына», арганізаваны пры падтрымцы Інфармацыйнага пункта Савета Еўропы ў Мінску.

Перспектыўным напрамкам развіцця міжнародных культурных сувязей Беларусі з'яўляецца турызм. Артыкул Д. Амяльковіч «Мэта паездкі? Культура» ад 9 красавіка пачынаецца паведамленнем аб тым, што ў Беларусі могуць увесці бясплатныя візы для наведавальнікаў фестываляў тым замежнікам, хто плануе сёлета наведаць Дзень беларускага пісьменства, Мінскі міжнародны фестываль «Лістапад» і інш. Журналістка згадвае, што пра гэта паведаміў на адкрыцці Міжнароднага кірмашу турысцкіх паслуг «Адпачынак – 2016» міністр спорту і турызму А. Шамко. Для атрымання бясплатнай візы ў нашу краіну турысту патрэбна будзе набыць квіткі на фестывалі, уключаныя ў штотыднёвы каляндар падзей, складзеных Нацыянальным агенцтвам па турызме. У публікацыі даецца пералік гэтых фестываляў: XXVII Міжнародны музычны фестываль імя І. Салярцінскага ў Віцебску, Міжнародны ваеннагістарычны фестываль, прысвечаны Першай сусветнай вайне «Скокі – 2016», XXI Міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі» ў Полацку, Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» ў аграгарадку Ляскавічы, Міжнародная акцыя «Ноч музеяў», XXVI Міжнародныя Шагалаўскія чытанні ў Віцебску, Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі IFMC у Віцебску, Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва «Белая вежа» ў Брэсце, XXV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і інш.

Аўтар артыкула падкрэслівае, што ўсе разам гэтыя мерапрыемствы садзейнічаюць прытоку турыстаў у Беларусь, а прапанаванае Міністэрствам спорту і турызму новаўвядзенне адносна бясплатных віз, нягледзячы на тое, што яно пакуль знаходзіцца на стадыі абмеркавання, «сведчыць пра чарговы крок у разуменні культурнага патэнцыялу краіны».

У матэрыяле «Праекты з Сербіяй» (21 мая) паведамляецца, што 18 мая 2016 г. адбылася сустрэча міністра культуры Б. Святлова з Надзвычайным і Паўнамочным Паслом Сербіі В. Кавачавічам, падчас якой абмеркаваны пытанні супрацоўніцтва краін у сферы культуры, а таксама вызначаны кірункі дзейнасці, якія трэба развіваць. Міністр культуры Беларусі выступіў з прапановай правесці Дні культуры Беларусі ў Сербіі ў 2017 г., а Дні культуры Сербіі ў Беларусі – у 2018-м. Міністр культуры Сербіі паведаміў, што Народная бібліятэка яго краіны з задавальненнем

прадставіць арыгінальныя выданні са свайго фонду ў сувязі з правядзеннем выставы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі «Францыск Скарына і яго эпоха» ў гонар 500-годдзя беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Б. Святлоў заявіў, што падтрымлівае ўсебаковае супрацоўніцтва паміж краінамі ў культурным плане: узаемадзеянне нацыянальных тэатраў і нацыянальных бібліятэк; удзел у міжнародных кніжных выставах; наладжванне кантактаў з сербскімі ўстановамі культуры і інш.

У матэрыяле «Нашы абразы ў Ватыкане» ад 21 мая паведамляецца пра афіцыйны візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі ў Італію з мэтай правядзення перамоў з Прэзідэнтам Італьянскай Рэспублікі С. Матарэлам і Папам Рымскім Францыскам. Тут жа даецца інфармацыя пра адкрыццё 18 мая ў Ватыкане выставы «Іканапіс Беларусі XVII–XXI стагоддзяў з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь». Адзначаецца, што праект пазнаёміць італьянскіх спецыялістаў і турыстаў з унікальнымі ўзорамі нашай сакральнай культуры.

Працяг гэтай тэмы знайшоў адлюстраванне ў матэрыяле І. Свірына ад 18 чэрвеня пад назвай «Дастаць са схованак. Уладзімір Пракапцоў: “Замежнікам цікава тое, чаго няма ў іх”». У сваім інтэрв’ю дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея расказаў пра несумненны поспех выставы. Ён падкрэсліў, што выбар беларускай іконы для папулярызацыі нашай культуры за мяжой абсалютна апраўданы, бо ў музеі Ватыкана, экспазіцыі якога перанасычаны шэдэўрамі сусветнага мастацтва, беларуская ікона прыцягвае ўвагу наведавальнікаў перадусім сваёй самабытнасцю.

16 ліпеня газета змясціла матэрыял Н. Бунцэвіч «Цэнтральная падзея Года культуры» пра юбілейны XXV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Журналістка назвала яго «святам дружбы, радасці, весялосці, творчасці».

У матэрыяле А. Саўчанкі ад 27 жніўня пад назвай «“Джобс” з бібліятэкі. Функцыянальны арсенал і тэхналогіі амерыканскіх кніжніц», змешчаным у рубрыцы «Рэальная сфера», паведамляецца, што з 23 ліпеня па 13 жніўня дырэктары абласных бібліятэк гарадоў Мінска, Гомеля, Брэста і загадчык аддзела літаратуры на замежных мовах Баранавіцкага цэнтра бібліятэк пабывалі ў бібліятэчных установах Злучаных Штатаў Амерыкі.

20 жніўня ў рубрыцы «Форум» апублікаваны матэрыял А. Ляшкевіч «Гандаль беларускім, але для замежнікаў». Чытачу прапаноўваецца цікавая інфармацыя аб тым, што ў Любліне прайшоў Ягелонскі кірмаш,

адноўлены ў 2007 г. на ўзор Сярэднявечча. Як адзначае журналістка, сёлета галоўнай тэмай стала вышыўка. Як заўсёды, удзельнічалі і беларускія майстры па розных відах рамёстваў.

На старонках газеты «Культура» асвятляецца і супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з краінамі СНД у межах Міждзяржаўнай праграмы «Культурныя сталіцы Садружнасці», прынятай Саветам па культурным супрацоўніцтве дзяржаў – удзельніц СНД. Аб гэтым матэрыялы Ю. Чарнякевіча «Бабруйск – 2017: лаўры культурнай сталіцы» (ад 7 мая) і Н. Панкратавай «Выбар Садружнасці: можа, Бабруйск?» (ад 27 жніўня).

Газета інфармуе сваіх чытачоў і пра міжнародныя ўзнагароды ў галіне культуры. У матэрыяле П. Васілеўскага «А які капітал? Парыжскія апладысменты беларусам» (ад 9 студзеня) апавядаецца пра тое, што творы В. Шобы і С. Парцянкова з Гомеля ўшанаваны прэміяй Тэйлара на выставе «Art Capital» у выставачнам комплексе Гран-Пале (Францыя). Удзел у гэтым мерапрыемстве бралі тысячы мастакоў з 40 краін свету. Беларусь тут была прадстаўлена ўпершыню.

У заметцы «Нясвіжу “Еўропа Нострa – 2016”» (ад 9 красавіка) паведамляецца, што Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік атрымаў прыз «Еўропа Нострa – 2016» у катэгорыі «Адданая служба». Гэты прыз прысуджаецца за высокія дасягненні ў еўрапейскіх краінах, якія не прымаюць удзел у праграме Еўрасаюза «Крэатыўная Еўропа».

Агляд матэрыялаў спецыялізаванага выдання, у якім асвятляецца міжнародная дзейнасць Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, сведчыць пра тое, што супрацоўніцтва з замежнымі краінамі ажыццяўляецца ў розных напрамках: фестывальны рух, тэатральнае і музычнае мастацтва, музейная і бібліятэчная справа, архітэктура, жывапіс, фатаграфія, народныя рамёствы, турызм і інш.

Такім чынам, газета «Культура» дае багатую інфармацыю пра ўдзел Беларусі ў фестывалях, конкурсах, днях культуры, што адбываюцца за мяжой, і пра тыя мерапрыемствы, якія праходзяць у нас з удзелам прадстаўнікоў іншых краін; змяшчае аналітычныя артыкулы пра замежнае мастацтва, узоры якога перыядычна дэманструюцца ў Беларусі; публікуе нарматыўна-прававыя акты, дзяржаўныя праграмы развіцця культуры Беларусі, праекты міжнароднага супрацоўніцтва; паведамляе пра высокія міжнародныя ўзнагароды, якімі адзначаны дасягненні нацыянальнай культуры. Усё гэта спрыяе далейшаму развіццю міжнароднай дзейнасці Беларусі ў галіне культуры, папулярызацыі нацыянальнай культуры за мяжой, уключэнню яе ў сусветны кантэкст.